# ЕЎРАБЮЛЕТЭНЬ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ВЫДАННЕ ПРАДСТАЎНІЦТВА ЕЎРАПЕЙСКАГА САЮЗА Ў БЕЛАРУСІ

ВЕРАСЕНЬ 2012



## ДЗЕНЬ ЕЎРАПЕЙСКАГА СУПРАЦОЎНІЦТВА: «Аб’яднаныя межамі, робімся бліжэй»

This project is funded
by the European Union

Прафесія – бацькі
Альтэрнатыва
дзіцячым дамам

Зрабіць SALTO
Магчымасці
для моладзі

# ЗМЕСТ / CONTENTS


## ПЕРСОНЫ МЕСЯЦА / FACES OF THE MONTH

3 
**Жазэ Мануэл Барозу «Еўрасаюз моцны адзінствам» / JOSE MANUEL BAROSSO: "EUROPEAN UNION IS STRONG IN ITS UNITY"**
On 12 September 2012, European Commission president Jose Manuel Barroso delivered his annual "State of the Union" address before the European Parliament in Strasbourg.

4 
**Герман Ван Рампей: «Рэформы ў ЕС пачынаюць прыносіць плён» / HERMAN VAN ROMPUY: "THE REFORMS IN THE EU ARE "STARTING TO BEAR FRUIT"**
On 5 September 2012, Herman Van Rompuy, the President of the European Council, met EU Heads of Delegation at their Annual Conference in Brussels. In his address, he openly spoke about challenges and prospects of today's EU, saying that crisis is "complex", but that the reforms launched by the Union are "starting to bear fruit".

## ЦЫТАТЫ / QUOTATIONS

5 
**Што гаварылі галоўныя еўрапейскія чыноўнікі / POINTS MADE: QUOTATIONS FROM TOP EUROPEAN UNION OFF ICIALS**
Catherine Ashton on Somalia's future, Mario Draghi on the stability of the euro, Androulla Vassiliou on creating national systems for the validation of non-formal and informal learning, Jose Manuel Barroso's call for a "federal Europe", Stefan Fule's vision of EU-Ukraine relations.

## ЛІЧБЫ / BY THE NUMBERS

7 
**€100 BILLION, 40 PERCENT OF THOSE SURVEYED, OVER 20 MILLION EUROPEANS, A 35-SECOND TV COMMERCIAL**
According to the latest Eurobarometer poll, which was commissioned by the European Parliament, some 40% of the 26,622 people interviewed in the 27 member states said they view the EU positively.

## ПАДЗЕЯ / TOP STORY

9 
**Профессия — родитель / PROFESSION — A PARENT**
During the past few years, Belarus has been actively implementing new forms of family-style placements of orphans. In terms of the number of children being raised by such families, this kind of placement has become the second most widespread solution — just after guardianship and before adoption.

12 **Энергазберажэнне з дзіцячага садка / SAVING ENERGY STARTING FROM ELEMENTARY SCHOOL**
The boarding school in Iuje, Hrodna region, hosts a pilot project in energy efficiency.

## НАПРАМАК РУХУ / ON THE MOVE

15 
**Сделать SALTO / SALTO — YOUTH IN ACTION**
This month, the Eurobulletin looks into SALTO resource centres, which provide youth with opportunities for training, volunteering, and other types of informal education. Also read about the experience of the European Voluntary Service (EVS) participants in Belarus: "The decision to work for the EVS was one of the best decisions I've taken in my life."

17 **«Жывая гісторыя майго краю» / «THE STORY OF MY REGION»**
This is the name of a new, two-year project aimed at developing the rural regions of Belarus and local cultural and history initiatives.

17 **«Всемирная уборка 2012» в Гродно / "WORLD CLEANUP 2012" IN HRODNA**
On 15 September 2012, Belarus participated in the "World Cleanup 2012". Hundreds of volunteers cleaned up forests and parks across the country, including in Hrodna region.

## ДАСЯГНЕННІ / MILESTONES

18 
**BYNANOERA: Европейское научное пространство на шаг ближе / BYNANOERA: EUROPEAN SCIENTIFIC SPACE — A STEP AT A TIME**
"Institutional development of nanoelectromagnetics: The place of Belarus in the expanding European scientific space" — news of the project.

19 **Навінавы мікс / News mix**
The finals of the 24th European Union Contest for Young Scientists (EUCYS) took place in Bratislava, Slovakia. A 17 year-old Pavel Litvinka from Belarus won one of the third prizes.

## ПАРТРЭТ / PORTRAIT

21 
**Брыё Белфлам / BRIEUC BELLEFLAMME, A VIOLINIST.**
"For my future career, the studies in Minsk will be of paramount significance. They might even prove to be a competitive advantage".

## ЕЎРАМАЗАІКА / EUROMOSAIC

22 
**Дзень Еўрапейскага супрацоўніцтва / EUROPEAN COOPERATION DAY: SHARING BORDERS, GROWING CLOSER**
Celebrating the achievements of European regions and countries working together across borders. That was the idea behind European Cooperation Day marked for the first time across Europe, both in EU member states and neighbouring countries, on 21 September.

## КАРОТКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ / NEWS IN BRIEF



**ЕЎРАБЮЛЕТЭНЬ**
Інфармацыйнае выданне Прадстаўніцтва Еўрапейскага Саюза ў Беларусі

вул. Энгельса, 34А/2
220030 Мінск
Рэспубліка Беларусь
Тэлефон: +375 (17) 328 66 13
Факс: +375 (17) 289 12 81
Эл. пошта:
delegation-belarus@eeas.europa.eu
delegation-belarus-press@eeas.europa.eu
(Press & Information)
http://eeas.europa.eu/delegations/belarus

Еўрабюлетэнь выдаецца пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза і Еўрапейскай Камісіі
Адказнасць за змест гэтага выдання ляжыць выключна на Particip GmbH і ніякім чынам не адлюстроўвае афіцыйнага пункту гледжання Еўрапейскага Саюза © European Union, 2012/13
The contents of this material are the sole responsibility of Particip GmbH and cannot be taken to reflect the views of the European Union

**Publisher:**
Particip GmbH, Merzhauser Str., 183, D — 79100 Freiburg
Phone: +49 (0) 761 790 740,
Fax: +49 (0) 761 790 7490,
info@particip.de

**Галоўны рэдактар / Chief Editor:**
Vladimir Smekhov / Уладзімір Смехаў
vladimir.smekhov@free.fr
**Рэдакцыйная група:**
**Шэф-рэдактар:**
Алена Штэрнік
**Аўтары:**
Уладзімір Бараніч, Вольга Мяроўская
**Дызайн і вёрстка:**
Марыя Золатава
**Ілюстрацыя вокладкі:**
ecday.eu

**Тыраж:**
299 асобнікаў
Бясплатны распаўсюд
Падпісана ў друк 29.09.2012
**Інтэрнэт-версія:**
http://eeas.europa.eu/delegations/belarus/press_corner/eurobulletin

# Жазэ Мануэл Барозу: «Еўрасаюз моцны адзінствам»

12 верасня прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі Жазэ Мануэл Барозу выступіў са штогадовым зваротам да дэпутатаў Еўрапейскага парламента. Асаблівы акцэнт быў зроблены на новым кірунку і новым вобразе мыслення для Еўропы. Спадар Барозу акрэсліў шлях да больш глыбокага еўрапейскага адзінства для пераадолення крызісу і адзначыў, што заклікае менавіта да *«дэмакратычнай федэрацыі нацыянальных дзяржаў»*, а не да *«звышдзяржавы»*. Гаворка ішла пра *«саюз з краінамі-сябрамі ЕС, а не супраць іх»*.



«Глабалізацыя патрабуе большага адзінства ад Еўропы. Большае адзінства патрабуе большай інтэграцыі. Вялікая інтэграцыя патрабуе больш дэмакратыі. Давайце не баяцца гэтых слоў: нам трэба рухацца да федэрацыі нацыянальных дзяржаў, якая сёння з'яўляецца нашым «палітычным гарызонтам.»

Для пераўтварэння ЕС у федэрацыю спатрэбіцца і *«новая дамова»*, якая павінна прыйсці на змену цяперашнім, абноўленым ў Лісабоне версіям Дагавора аб Еўрапейскім Саюзе і Дагавора аб функцыянаванні Еўрапейскага Саюза. Паводле слоў Барозу, да наступных выбараў у Еўрапейскі парламент, якія адбудуцца ў 2014 годзе, Еўрапейская Камісія *«прадставіць прапановы па архітэктуры будучага Еўрапейскага Саюза»* і прапануе *«ясныя ідэі наконт змен ва ўстаноўчых дагаворах ЕС»*.

Цяпер жа, лічыць Барозу, у ЕС наспела неабходнасць маштабнай палітычнай рэформы, бо Саюз сутыкаецца з палітычным крызісам, крызісам даверу: *«Занадта часта мы бачылі зачараванае кола: на самітах кіраўнікоў дзяржаў і інстытутаў ЕС прымаліся важныя рашэнні, але на наступны дзень тыя ж людзі, якія прынялі гэтыя рашэнні, ставілі іх пад сумненне, кажучы, што яны ідуць або занадта далёка, або недастаткова далёка»*.

У сваёй прамове Барозу таксама закрануў іншыя важныя напрамкі паглыблення інтэграцыі ўнутры ЕС. На яго думку, ЕС павінен рухацца да больш цеснага эканоміка-манетарнага саюза (не толькі забяспечваць дзейнасць адзінай валюты, але і выраўноўваць узровень канкурэнтаздольнасці эканомік дзяржаў ЕС), да новага банкаўскага саюза (што забяспечыць агульнаеўрапейскі нагляд за дзейнасцю банкаў), да фіскальных саюзаў (што забяспечыць наддзяржаўны кантроль за дысбалансам фінансаў краін ЕС) і да паглыблення інтэграцыі на адзіным рынку, у прыватнасці, да стварэння паўнавартаснага рынку працы ЕС.

Спадар Барозу таксама выказаў надзею на пабудову гэтай еўрапейскай публічнай прасторы, у прыватнасці, на ўмацаванне агульнаеўрапейскіх палітычных партый, якія ў 2014 годзе здолелі б вылучаць сваіх кандыдатаў на пасады кіраўнікоў Еўрапейскай Камісіі і Еўрапейскага парламента.

Сваю прамову Барозу падсумаваў меркаваннем, што ў Еўропе існуе патрэба *«новага мыслення»*: *«Я веру ў тое, што Еўропа мае душу. Гэтая душа можа даць нам сілу і рашучасць зрабіць тое, што мы павінны зрабіць»*.

**Поўны тэкст на http://europa.eu**

«У Еўропе нам больш не патрэбныя сцены, якія б нас падзялялі. Мы пачнем з таго, што больш глыбокая інтэграцыя не можа быць чымсьці для абраных. Ніхто не застанецца ўбаку. Еўрасаюз больш моцны адзіны, а не падзелены — моцны ў адзінстве аднаго рынку, усіх краін-удзельніц і ўсіх інстытутаў.»

фота: ec.europa.eu

# Герман Ван Рампей: «Рэформы ў ЕС пачынаюць прыносіць плён»



**У сваёй прамове 5 верасня падчас сустрэчы з кіраўнікамі прадстаўніцтваў ЕС ва ўсім свеце Прэзідэнт Еўрапейскага Савета Герман Ван Рампей адкрыта распавёў пра галоўныя выклікі і перспектывы сённяшняга Еўрапейскага Саюза. Паводле яго слоў, крызіс у ЕС не мае простага рашэння, але рэформы ўжо пачынаюць прыносіць свой плён.**

«Як казаў Эйнштэйн, для кожнай праблемы існуе рашэнне, якое з'яўляецца ясным, простым — і ілжывым. У нашай сітуацыі існуе некалькі такіх ясных, простых і памылковых рашэнняў, напрыклад, выхад Грэцыі з зоны еўра, безумоўнае напаўнення сістэмы грашыма або «магічнае стварэнне» федэратыўнай дзяржавы па мадэлі ЗША. Усе гэтыя рашэнні не адпавядаюць складанасці выклікаў, з якімі сутыкаецца ЕС».

«Два гады таму некаторыя з нашых рашэнняў немагчыма было нават уявіць», — кажа прэзідэнт Еўрапейскага Савета. Паводле яго слоў, цяпер «лідэры ЕС павінны праявіць сапраўднае жаданне знайсці адказ на сістэмную прыроду крызісу» і «дабудаваць дом, пабудаваны пакуль толькі напалову». «І менавіта гэта з'яўляецца новым» у цяперашнім ЕС.

Усе ў ЕС зараз «прызнаюць, што крызіс — гэта не толькі сума праблем асобных краін, але і вынік недахопу архітэктуры эканамічна-манетарнага саюза». А таму лідэры ЕС гатовыя «разглядаць любыя пытанні, без табу. Калі ЕС хоча, каб інвестары куплялі 10-гадовыя дзяржаўныя аблігацыі, трэба даць ім выразную карціну, якой будзе зона еўра праз дзесяць гадоў», — лічыць спадар Рампей.

Паводле слоў Ван Рампея, рэформы ў дзяржавах ЕС ужо «пачынаюць прыносіць свой плён». Апошнія дадзеныя сведчаць аб паляпшэнні канкурэнтаздольнасці эканомікі ЕС па двух ключавых паказчыках — кошту працы і гандлёвым дэфіцыце. Ён таксама дадае, што збліжэнне краін ЕС па параметрах эканамічнага развіцця і

«Гісторыя знаходзіцца на баку нашых каштоўнасцяў. Свет ніколі не быў такім дэмакратычным, якім ён ёсць зараз. Гэта акалічнасць павінна надаць нам упэўненасці».

эканамічнай палітыкі ідзе значна больш актыўна, чым два гады таму.

Прыярытэтам ЕС цяпер з'яўляецца пабудова чатырох саюзаў, якія ўзмацняць інтэграцыю ўнутры ЕС:

- банкаўскага саюза, нацэленага на тое, каб падаткаплацельшчыкі перасталі сістэматычна плаціць за памылкі банкаў;
- фіскальнага саюза, нацэленага на пазбяганне дэфіцытаў дзяржаўнага бюджэту, якія вядуць да страты стабільнасці (гэты саюз будзе будавацца, у прыватнасці, дзякуючы выкананню заканадаўства ЕС і супрацоўніцтву краін);
- эканамічнага саюза, нацэленага на тое, каб сумесна паляпшаць канкурэнтаздольнасць зоны еўра ў цэлым;
- глыбокага палітычнага саюза, нацэленага на падтрыманне эканамічных дзеянняў узмоцненай дэмакратычнай легітымнасцю і адказнасцю.

Ван Рампей таксама адмаўляе, што Еўропа цяпер сутыкаецца з радыкальнымі альтэрнатывамі — або распад ЕС, або яго імгненнае пераўтварэнне ў федэрацыю. Такое бачанне, на яго думку, памылковае, таму што Еўропа «пераадолее крызіс не шляхам рэвалюцыі, а шляхам рэформаў і эвалюцыі».

У сваёй прамове кіраўнік Еўрапейскага Савета таксама закрануў краіны Усходняга партнёрства. «Ва ўсіх намаганнях ў ажыццяўленні эканамічных і палітычных рэформаў у гэтых краінах вы можаце адчуць сілу прыцягнення Еўрапейскага Саюза», — лічыць ён.

Ван Рампей таксама падкрэслівае важнасць зон свабоднага гандлю ў развіцці адносін ЕС са знешнімі партнёрамі: «Еўрапейскі Савет павінен працягваць падтрымліваць перамовы аб зоне свабоднага гандлю, што зараз вядуцца ці будуць весціся ў будучым».

фота: ec.europa.eu

# Што гаварылі еўрапейскія чыноўнікі ў жніўні-верасні

У звароце да Еўрапарламенту прэзідэнт Еўрапейскай Камісіі Жазэ Мануэл Барозу выказаўся за больш шчыльнае аб’яднанне краін ЕС на новай федэратыўнай аснове. На яго думку, гэта дапаможа пераадолець у Еўропе фінансава-эканамічны крызіс і забяспечыць паскоранае развіццё. *«Цяперашняму Еўрапейскаму Саюзу неабходна эвалюцыя. Нам трэба працаваць над стварэннем федэрацыі нацыянальных дзяржаў, і давайце не будзем палохацца гэтага словазлучэння»*, – заклікаў Барозу.





З 13 па 16 верасня 2012 года ў Лівадыйскім палацы Ялты праходзіў 9-ы форум Ялцінскай еўрапейскай стратэгіі (YES), вядомы тым, што збірае сусветных лідэраў, якія дзеляцца сваім бачаннем цяперашніх і будучых працэсаў ва ўсіх сферах жыцця грамадства. У сваім выступе камісар Еўрапейскага Саюза па пытаннях пашырэння і еўрапейскай палітыкі суседства Штэфан Фюле падзяліўся сваім бачаннем адносін ЕС з Украінай.

*«У мяне была мара — убачыць Украіну глыбока ўкаранёнай сярод дэмакратый Еўрапейскага Саюза. Я марыў пра канец падзелу Еўропы, пра яе аб'яднанне, трансфармацыю і росквіт.*

*Усе мы, што сабраліся тут, — сябры Украіны. І ўсе мы ведаем, што наступныя месяцы будуць вельмі адказнымі. Як Украіна будзе вырашаць праблему выбарачнага правасуддзя, як яна будзе прасоўваць рэфомы судовай сістэмы і рэформы Генеральнай пракуратуры, і, самае галоўнае, ці зможа краіна арганізаваць наступныя выбары ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі — менавіта гэтыя фактары вызначаць, дзе знаходзіцца Украіна і наколькі вольнай ад дыскрымінацыі яна стала за апошнія два гады. Ці карыстаюцца грамадзяне большымі свабодамі? Ці з'яўляюцца СМІ сапраўды вольнымі? Ці прыносіць вынікі рэформа судовай сістэмы? Калі я задаю гэтыя пытанні, я не хачу, каб вы думалі, што мы навязваем Еўрапейскі Саюз Украіне. Зусім не. Перш за ўсё, мы гаворым аб падтрымцы Украіны ў яе імкненні пабудаваць вяршэнства права ўнутры самой Украіны».*

**Поўны тэкст на**
**http://eeas.europa.eu/delegations/ukraine/**
**(навіны за 14-е верасня)**

фота: ec.europa.eu



Высокі прадстаўнік ЕС па замежных справах і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан наведала сталіцу Самалі Магадзішу, дзе сустрэлася з кіраўніцтвам краіны. Гэты візіт напрыканцы васьмігадовага пераходнага перыяду ў Самалі падкрэсліў гатоўнасць ЕС дапамагчы краіне забяспечыць сумленнае кіраванне, садзейнічаць эканамічнаму і грамадскаму развіццю, а таксама вырашэнню праблем бяспекі. *«Заканчэнне пераходнага перыяду прынясе перспектыву доўгатэрміновай згоды, росквіту ды стабільнасці для краіны і для мільёнаў людзей, якія пакутвалі ад 20-гадовага канфлікту,* — адзначыла Эштан. — *Новыя інстытуты ўлады павінны як мага хутчэй стабілізаваць становішча ва ўсіх раёнах. Я заклікаю іх дзейнічаць хутка, рашуча, празрыста і ў інтарэсах самалійскага народу. Я хачу выкарыстаць магчымасць, каб запэўніць самалійскі народ у сталай падтрымцы ЕС. Вы не адны».*

*«Па ўсёй Еўропе вядуцца фундаментальныя спрэчкі аб будучым еўра. Многія грамадзяне пытаюцца, куды рухаецца Еўропа, бо ўсе рашэнні праблемы прапаноўваюць два варыянты: альбо вярнуцца ў мінулае, альбо рухацца ў бок Злучаных Штатаў Еўропы. Мой адказ: каб мець стабільны еўра, нам не трэба выбіраць паміж гэтымі крайнасцямі*, — адзначыў прэзідэнт Еўрапейскага цэнтральнага банка Марыа Драгі ў сваім артыкуле, апублікаваным у нямецкай газеце «Die Zeit» 29 жніўня 2012 года. — *З пункту гледжання Еўрапейскага цэнтрабанка моцны эканамічны саюз — важнае дапаўненне адзінай манетарнай палітыкі».* Драгі ўпэўнены, што новая структура еўразоны створыць умовы для ўстойлівага росквіту ўсіх краін з адзінай еўрапейскай валютай, асабліва для Германіі, а палітычны саюз можа і павінен развівацца крок у крок з фіскальным, эканамічным і фінансавым саюзам.





Еўракамісія заклікае краіны Еўрасаюза да 2015 года стварыць нацыянальныя сістэмы для праверкі і прызнання нефармальнай адукацыі (гэта значыць атрыманай па-за межамі школы і ўніверсітэта). *«Нашая мэта ў тым, каб дазволіць усім грамадзянам напоўніцу выкарыстоўваць магчымасці навучання для павышэння іх кваліфікацыі і працаўладкавання як на працоўным месцы, так і праз грамадзянскую супольнасць ці інтэрнэт*, — адзначыла Камісар па пытаннях адукацыі, культуры, шматмоўя і моладзі Андрула Васіліу. — *Падчас высокага ўзроўню беспрацоўя і нізкага эканамічнага росту вельмі важна, каб Еўропа развівала правільныя навыкі і ўменні для павышэння канкурэнтаздольнасці і сацыяльнай інтэграцыі».* Такім чынам Еўракамісія імкнецца даць магчымасць знайсці працу маладым беспрацоўным, а таксама тым, хто мае недастатковы ўзровень «фармальнай» адукацыі, як, напрыклад, старэйшыя ці нізкакваліфікаваныя працаўнікі. Адначасова Еўракамісія імкнецца павялічыць даступнасць вышэйшай адукацыі, асабліва для дарослых студэнтаў.

фота: ec.europa.eu



**100 млрд. еўра** выдаткуе Еўрапейскі Саюз Іспаніі для выканання неабходных рэформаў. Аб гэтым нагадаў пасля сустрэчы з прэм’ер-міністрам Іспаніі Марыяна Рахоем прэзідэнт Еўрапейскага Савета Герман ван Рампей. Апошні таксама выказаў упэўненасць, што рэструктурызацыя фінансавага сектара краіны, калі яна будзе праведзена цалкам, хутка і рупліва, дапаможа высветліць сітуацыю з банкаўскай сістэмай, аднавіць давер рынкаў, падтрымаць іспанскую эканоміку і ў рэшце зменшыць наступствы крызісу для іспанскіх падаткаплацельшчыкаў.



**40% апытаных** Еўрабарометрам па замове Еўрапейскага парламента грамадзян (усяго 26 622 рэспандэнтаў з 27 краін ЕС) ставяцца да Еўрапейскага Саюза станоўча. Гэта на 9% больш, чым у лістападзе 2011 года. 57% рэспандэнтаў падтрымалі думку пра тое, што галасаванне на наступных выбарах у Еўрапарламент — найлепшы спосаб зрабіць чутнымі галасы еўрапейцаў. *«Атрыманыя вынікі абнадзейваюць»*, — пракаментаваў апытанне Старшыня Еўрапарламента Марцін Шульц.

**60 млн. еўра** будзе выдаткавана Арменіі па прынятай Еўрапейскай Камісіяй Штогадовай праграме дзеянняў праз Еўрапейскі інструмент суседства і партнёрства. Асноўная мэта гэтай фінансавай падтрымкі ў межах Усходняга партнёрства — паскарэнне рэформы сістэмы правасуддзя ў краіне, а таксама пашырэнне двухбаковых адносін, палітычнай асацыяцыі і эканамічнай інтэграцыі Арменіі і ЕС. На такую ж суму можа разлічваць Грузія для мадэрнізацыі сельскай гаспадаркі, павышэння харчовай бяспекі і падтрымкі таварыстваў дробных фермераў праз навучане і тэхнічныя кансультацыі, а таксама праз стварэнне інстытутаў, якія будуць адказваць за эканамічную інтэграцыю ў ЕС.



фота: ec.europa.eu, Particip GmbH

**20 з лішнім мільёнаў** еўрапейцаў з 50 краін скарыстаюць магчымасць бясплатна наведаць тысячы месцаў, якія рэдка адкрываюць для наведвальнікаў, падчас акцыі, прымеркаванай да Дня еўрапейскай спадчыны, якая будзе доўжыцца некалькі месяцаў. *«Гэта цудоўная нагода заўважыць, нарэшце, культурныя каштоўнасці, што ляжаць літаральна на парозе. Праз адкрыццё дзвярэй адкрыць нашыя вочы і розум»*, — лічыць Камісар па пытаннях адукацыі, культуры, шматмоўя і моладзі Андрула Васіліу. У рамках акцыі ў 21 еўрапейскай краіне пройдзе трэці ў гісторыі фотаконкурс «Wiki любіць помнікі» (**www.wikilovesmonuments.org**), удзельнікі якога змогуць палепшыць якасць ілюстравання краязнаўчых арітыкулаў Вікіпедыі.



фота: Particip GmbH



**35-секундны** тэлевізійны ролік пра тое, як канкрэтнымі справамі дапамагчы захаванню навакольнага асяроддзя, падрыхтавала Прадстаўніцтва ЕС ва Украіне пры падтрымцы Міністэрства экалогіі ў рамках супрацоўніцтва паміж ЕС і Украінай у правядзенні інфармацыйных кампаній і абмене досведам абыходжання з адкідамі, іх утылізацыі і паўторнага выкарыстання. Ролік павінен паказаць, што нават нязначныя змены ў паводзінах могуць садзейнічаць паляпшэнню стану навакольнага асяроддзя ў маштабах краіны (штодзень ва Украіне ўтвараецца каля 50 000 тон смецця).
Паглядзець ролік «Думай пра смецце, якое ты пакідаеш» можна на **www.youtube.com** па запыце **EU_Garbagespot**

# Профессия — родитель



**В последние несколько лет в Беларуси активно используются новые формы устройства сирот на воспитание в замещающие семьи. По количеству детей, находящихся в них на воспитании, такая форма заботы о сиротах находится на втором месте – после опеки и до усыновления.**

### Без «казарм для детей»

Впервые вопрос об альтернативе детским домам в Беларуси был поднят четыре года назад. 8 сентября 2008 года на встрече с журналистами российских СМИ президент Беларуси назвал детские дома казармами для детей и поставил задачу *«в течение пяти лет закрыть все детские дома и переселить детей в детские деревни»*. Сразу же после этого в Министерстве образования начали строить планы по реорганизации всех детских домов, приютов и интернатов к 2015 году в детские дома семейного типа. В 2011 году, правда, планку пришлось снизить и предусмотреть закрытие *«не менее половины интернатных учреждений для детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей»*.

За 5 лет на 41% сократилось число детей-сирот, находящихся в интернатных учреждениях, а общее число детей-сирот и детей, оставшихся без попечения родителей, уменьшилось на 3,5 тыс. человек (с 28,2 тыс. до 24,7 тыс.). Закрыты 23 и реорганизованы 9 интернатных учреждений системы образования для детей-сирот. На 40% сократилось число детей, лишившихся родительской опеки по решению суда. Втрое уменьшилось число отказов от детей. В родные семьи по решению суда о восстановлении родительских прав возвращено более 2,2 тыс. детей.

### Родитель как профессия

Замещающая семья — явление достаточно новое не только для Беларуси, но и для всего постсоветского пространства, тогда как в странах Европейского Союза такая форма заботы об оставленных биологически-

**По состоянию на 1 января 2012 года**

**в Беларуси было 18 875 детей-сирот** и детей, оставшихся без попечения родителей, которые воспитывались в **13 124** семьях. Из них: **10 164** ребенка — в опекунских семьях, **6 995** — в замещающих семьях, **1 223** — в детских домах семейного типа, **493** ребенка — в детских деревнях (городках), **6 736** детей находятся на усыновлении в семьях граждан Беларуси (**5 932** семьи).

фота: Уладзімір Бараніч

***Зинаида Воробьева, начальник отдела охраны детства Комитета по образованию Мингорисполкома:*** *«Замещающая семья, как и детский дом семейного типа, — это профессиональные формы семейной заботы о детях, оставшихся без попечения родителей. Беря ребенка на воспитание, вы заключаете договор с управлением образования и на основании этого договора становитесь законным представителем ребенка, выполняете обязанности по его воспитанию. Государство разрешает совмещение этой работы с основной: родителем-воспитателем можно работать как на полную ставку, так и на 0,5 ставки. Воспитание в приемной семье или детском доме семейного типа не влечет за собой возникновения между сторонами алиментных и наследственных правоотношений. То есть, родители не обязаны помогать материально взятому на воспитание ребенку после его совершеннолетия, как и предоставлять ему место жительства. Точно так же и ребенок по достижении им совершеннолетия не обязан содержать нетрудоспособных, нуждающихся в помощи бывших родителей-воспитателей».*

ми родителями детях существует не один десяток лет.

В отличие от усыновления или опеки, в замещающих семьях за материальное обеспечение детей отвечает государство, а родители выполняют функцию воспитателей. Один из родителей получает статус воспитателя и зарплату, как если бы работал в детском доме. Но дети-сироты при этом воспитываются рядом с родными детьми родителей-воспитателей, имеют те же права и обязанности.

### «Все дети включены»

Так называется проект по оказанию помощи белорусским детям, находящимся в учреждениях и в замещающих семьях, который реализуется с 1 июля 2011 г. при поддержке Европейского Союза. Цель проекта заключается в улучшении условий жизни и перспектив белорусских детей, оставшихся без попечения родителей, через обмен опытом на различных тренингах, семинарах и встречах.

Проект осуществляется белорусской общественной организацией «Здоровый выбор» (**www.choice.by**) совместно с голландской некоммерческой организацией «Международные инициативы развития детей» (**www.icdi.nl**).

Одним из мероприятий по обмену европейским опытом с белорусскими коллегами стал прошедший 21-22 августа семинар для специалистов ведомств по охране детства и замещающих родителей Минска. В первый день социальные педагоги рассмотрели темы «Организация замещающей опеки», «Поддержка и наставничество замещающих родителей», «Психологическая и социальная поддержка замещаю-







фота: Уладзімір Бараніч

щих семей» и «Коррекционное вмешательство в замещающих семьях». Во второй день семинара замещающие родители обсудили темы, имеющие непосредственное отношение к их работе с детьми: «Принимаем ребенка у себя дома: как это касается вас и вашей семьи?», «Привязанность», «Разлука и утрата», «Сотрудничество с профессионалами и биологическими семьями в помощь всем детям в вашем доме».

Семинар проводили международный эксперт по замещающему родительству (Нидерланды) Элизабет ван Демунт и руководитель партнерской голландской организации «Международные инициативы развития детей» профессиональный психолог Матаис Эувема. Активное участие в семинаре приняла также начальник отдела охраны детства Комитета по образованию Мингорисполкома Зинаида Воробьева. Она рассказала голландским гостям об особенностях белорусской системы опеки над детьми.

Среди родителей-воспитателей оказался и один «профессиональный папа» и приверженец идеи большой семьи — Александр Садовский, воспитывающий девятерых детей (из них двое родных и один усыновленный ребенок). Александр сам стал сиротой в 16 лет и, по его словам, на собственном опыте знает, что такое расти без родителей. Профессиональный тренер по тайскому боксу, он поделился своим уникальным опытом сочетания семейного и спортивного воспитания и планами создания детского семейного дома спортивного творчества, где основным хобби, объединяющим семьи, будет спорт.

***Александр Садовский, отец-воспитатель 9 детей:***
*«У нас, у славян, очень древняя культура воспитания в больших семьях. Был малый круг из 9 детей, и большой круг из 16 детей. Система, когда дети помогают родителям, самая удобная для адаптации. У нас традиционно работала модель воспитания, когда отец подтягивает к себе тех старших детей, на которых он может положиться. И они уже выполняют более мелкие поручения, занимаются средними и младшими детьми. Самая главная задача отца по отношению к детям — быть эталоном поведения, каким был для меня мой отец».*









***Владислав Ковров, руководитель ОО «Здоровый выбор»:***
*«Мы стремимся обучить специалистов, работающих в сфере защиты детей, разработать и реализовать дружественные ребенку практики привыкания к новой семье, а также информировать общество о необходимости всесторонне заботиться о детях, оставшихся без родителей».*

фота: Уладзімір Бараніч

# Энергазберажэнне з дзіцячага садка

**У Іўеўскай школе-інтэрнаце ажыццяўляецца пілотны праект па забеспячэнні энергаэфектыўнасці будынка школы. Праект прадугледжвае поўную мадэрнізацыю будынка – забеспячэнне цеплаізаляцыі, замену вокнаў, дзвярэй, труб, сістэм вентыляцыі і асвятлення, а таксама ўсталяванне сонечнай батарэі і цеплавога насоса.**



***Алена Ракава, каардынатар праектаў ЕС у галіне навакольнага асяроддзя і энергетыкі:***
*«Мы вырашылі, што мадэрнізацыя гэтай навучальнай установы будзе мець найбольшы эфект у плане эканоміі энергарэсурсаў. Пасля гэтага была распрацавана праектная дакументацыя і абвешчаны тэндэр, які выйграла ўкраінская кампанія ARDI. Аб'ект пілотны, першы для Еўрасаюза, мясцовых уладаў, Дэпартамента па энергаэфектыўнасці. Не ўсё атрымліваецца з першага разу. Але ўсе ўрокі карысныя. Мы не паспелі здаць школу ў верасні з-за нестыковак ў заканадаўчай базе Еўрасаюза, Беларусі і Украіны. Але да пачатку ацяпляльнага сезона дзеці пяройдуць у новыя светлыя і цёплыя класы. Гэта будзе не толькі эканамічна выгадны праект, але і добры прыклад».*



Іўеўская дапаможная школа-інтэрнат для дзяцей з асаблівасцямі развіцця была пабудаваная паўстагоддзя таму, і, натуральна, даўно не проста не адпавядала сучасным патрабаванням па энергазберажанні, а вымагала капітальнага рамонту. Менавіта гэтая школа прыцягнула ўвагу экспертаў Еўрапейскага Саюза, якія ў супрацоўніцтве з мясцовымі ўладамі вырашылі зрабіць яе пляцоўкай для рэалізацыі пілотнага праекта па энергаэфектыўнасці. Першапачаткова планавалася засяродзіцца ўласна на энергетычным складніку — на цеплавой рэабілітацыі будынка плошчай 2800 квадратных метраў, замене старых вокнаў на сучасныя шклопакеты, дзвярэй, труб, сістэм

фота: EZERIN PR





фота: EZERIN PR

вентыляцыі і асвятлення, а таксама ўстаноўцы сонечнай батарэі. Як адзначаюць спецыялісты, дзякуючы ўнікальнай назапашвальнай сістэме дзесяцікілаватны сонечны калектар дазволіць эканоміць нават узімку. Калі ж сонечнай энергіі для нагрэву вады ў нейкі перыяд будзе недастаткова, разумнае абсталяванне аўтаматычна пераключыцца на сілкаванне ад звычайнай гарадской электрычнай сеткі.

Як распавяла менеджэр праекта Алена Ракава, з 2007 года ў Беларусі рэалізуецца праект Еўрапейскага Саюза EuropeAid/129710/C/SUP/BY «Падтрымка рэалізацыі комплекснай энергетычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь». Праект мае чатыры складнікі: «Падтрымка ва ўкараненні энергетычнай стратэгіі ў галіне электраэнергетыкі», «Падтрымка ва ўкараненні палітыкі па энергаэфектыўнасці», «Падтрымка ў галіне развіцця аднаўляльных крыніц энергіі», «Распрацоўка пілотных праектаў і падтрымка падчас іх укаранення». З беларускага боку галоўнымі ўдзельнікамі сталі Міністэрства энергетыкі і Дэпартамент па энергаэфектыўнасці Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі.

Для рэалізацыі праекта ў Іўеўскай школе-інтэрнаце Еўрапейскі Саюз выдаткаваў 768 тысяч еўра. 3,2 мільярды рублёў выдаткаваў беларускі бок. Так, мясцовыя ўлады ўзялі на сябе выдаткі па правядзенні капітальнага рамонту, пракладанні новай электраправодкі і замене даху. Таму школа-інтэрнат і прылеглая да яе тэрыторыя зараз нагадваюць адну вялікую будоўлю.

Школа-інтэрнат разлічаная на 800 дзяцей, але зараз тут знаходзіцца 50 дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Таму пасля здачы ў экс-

***Рыгор Аршынаў, прадстаўнік кампаніі ARDI, якая выйграла тэндэр на правядзенне падрадных работ:***

*«Будынак вельмі стары і халодны. Яго, на жаль, нельга перабудаваць, але магчыма максімальна ўцяпліць. Праект складаецца з чатырох частак. Першы прадугледжвае змяншэнне стратаў цяпла ў галоўным навучальным корпусе. Для гэтага мы замяняем вонкавыя контуры вокнаў і дзвярэй на энергазберагальныя. З дапамогай сучасных матэрыялаў уцяпляем фасад. Эканоміць да 40% электраэнергіі дазволіць замена састарэлых свяцільняў. Поўным ходам ідзе мадэрнізацыя сістэмы ацяплення — цяпер на кожным радыятары будуць усталяваны рэгулятары цяпла. Другі лот — гэта замена старой канальнай цепласеткі, з якой мы паспяхова справіліся. Цікавыя тэхналогіі мы выкарыстоўваем для трэцяга лота — вентыляцыі лазнева-пральнага комплексу і душавых. Цяпло мы будзем падымаць з грунту пры дапамозе цеплавога насоса, а таксама выкарыстоўваць цяпло выцяжнога паветра (сістэма рэкуперацыі). Чацвёртая частка — падагрэў вады для душавых з дапамогай сонечных калектараў. Неўзабаве ўстановім сонечныя фільтры, якія будуць забяспечваць выхаванцаў школы-інтэрната цёплай вадой амаль круглы год. Пасля рэалізацыі праекта гэта будзе зусім іншая школа: цёплая, светлая, утульная».*





***Уладзімір Кузьміч, намеснік старшыні Іўеўскага райвыканкама:***
*«Выконваючы патрабаванні Дырэктывы прэзідэнта №3, наш раён штогод эканоміць каля 10% энергарэсурсаў. Гэта дасягаецца за кошт укаранення энергаэфектыўных праектаў. Мы здолелі перайсці на выкарыстанне мясцовых відаў паліва, і цяпер Іўеўшчына, выконваючы сацыяльныя стандарты, ужо практычна не выкарыстоўвае газ. Летась мы завяршылі рэканструкцыю ГЭС у Жэмыслаўі, пабудаванай больш за пяцьдзесят гадоў таму. Эфект відавочны: зараз мясцовая буйная гаспадарка практычна цалкам забяспечваецца электраэнергіяй. Мы імкнемся выкарыстоўваць перадавыя энергаэфектыўныя тэхналогіі, у тым ліку сонечныя калектары. Невялікі вопыт у атрыманні цяпла ад сонечных патокаў мы ўжо маем, а ўстаноўка сонечнага калектара ў Іўеўскай школе-інтэрнаце – гэта ўжо, вядома, новы ўзровень».*

***Міхаіл Валчэцкі, старшыня Іўеўскага райвыканкама:***
*«Мы ўпершыню працуем па такім праекце, дзе прадугледжана ўкараненне новых энергаэфектыўных тэхналогій, і, безумоўна, усведамляем усю ўскладзеную на нас адказнасць. Цешыць, што ўжо склаўся ланцужок нашых сумесных дзеянняў, што дасць магчымасць паспяхова рэалізаваць праект і ў выніку навучыцца эканоміць на энерганосьбітах».*

***Аляксандр Раманюк, начальнік аддзела адукацыі Іўеўскага райвыканкама:***
*«Нашу школу-інтэрнат выбралі з 12 устаноў адукацыі Беларусі. Магчыма, таму, што гэты будынак ўжо даволі стары – 1961 года. І з таго часу капітальны рамонт тут не праводзіліі. Цяпер жа будынак уцяплілі, у ім заменяць вокны і дзверы, усталююць сістэмы, якія дапамогуць захоўваць цяпло ў памяшканнях. Але самае цікавае, што ваду ў тутэйшай лазні і пральні стануць награваць з дапамогай сонечных батарэй. Праўда, восенню, зімой і ранняй вясной, калі на вуліцы холадна, мы па-ранейшаму будзем пераходзіць на сістэму электрычнага падагрэву».*

плуатацыю абноўленага будынка ў ім плануецца стварыць комплекс, куды ўвойдуць сацыяльна-педагагічны цэнтр і цэнтр карэкцыйнага навучання. Два адрамантаваныя і мадэрнізаваныя паверхі будуць аддадзены пад дзіцячы садок. Як распавёў начальнік аддзела адукацыі Іўеўскага райвыканкама Аляксандар Раманюк, пасля рэалізацыі праекта гэтая ўстанова адукацыі стане пляцоўкай для навучання энергаэфектыўнасці і энергазберажэнню. Прычым вучыць гэтаму плануецца ўжо ў дзіцячым садку.

Як адзначыла дырэктар школы Алена Цімашэнка, актыўны ўдзел у маштабнай будоўлі прыняў і педагагічны калектыў навучальнай установы. Педагогі часова перакваліфікаваліся ў маляроў і тынкоўшчыкаў, выканаўшы немалы аб'ём рамонтных работ. Рэканструкцыя будынка Іўеўскай школы-інтэрната будзе завершана ў лістападзе.



фота: EZERIN PR

# Сделать SALTO

**Сеть SALTO – это восемь ресурсных центров, которые в рамках Европейской молодежной программы, финансируемой Евросоюзом, обеспечивают возможности для повышения качества неформального обучения для молодежи. Центр SALTO в Восточной Европе и на Кавказе (EECA) основан в октябре 2003 года польским Национальным агентством «Молодежь в действии» и направлен на поддержку молодежных программ в странах-партнерах из Восточной Европы и Кавказа (Армении, Азербайджана, Беларуси, Грузии, Молдовы, России, Украины). В 2007-2011 гг. национальные отделы програмы получили 2400 заявок на гранты для проектов в рамках Европейской волонтерской службы. За пять лет программа «Молодежь в действии» в регионе Восточной Европы и Кавказа одобрила 1770 грантов на общую сумму 36,4 млн. евро для 3000 добровольцев. 33400 молодых людей приняли участие в проектах молодежного обмена.**



## Ресурсный центр SALTO EECA предоставляет следующие возможности:

- **Служба поддержки на Faceboo**k — для информирования о предстоящих мероприятиях, публикации фототчетов с проектов, поиска партнеров, обсуждения проблем молодежи. **www.facebook.com/saltoeeca**
- **Центр образовательных ресурсов «Мультипликаторы»** — сеть опытных людей по работе с молодежью в Восточной Европе и на Кавказе. **www.salto-youth.net/eecamultipliers**
- **EVS-тренинги ресурсного центра** в Восточной Европе и на Кавказе. **www.salto-youth.net/EVStrainingsEECA**
- **Справочник EECA** — интернет-ссылки на источники в Восточной Европе и на Кавказе, которые могли бы помочь в подготовке проектов. **www.salto-youth.net/eecamanual**




фота: Particip GmbH





SALTO-YOUTH
EASTERN EUROPE AND CAUCASUS
RESOURCE CENTRE
Education and Culture

## Белорусский опыт добровольцев Европейской службы волонтеров (EVS)

### Marcin, 26 лет, Польша

*«Я изучал в университете историю и культуру стран бывшего Советского Союза и хотел сравнить то, о чем читал, с тем, что увижу. Я хотел лучше понять представителей другой культуры, выучить их язык и что, самое важное, помочь им. Когда я сообщил родителям о своем решении ехать в Беларусь, они его приняли легко. А вот мои друзья и коллеги боялись за мою безопасность и не могли понять, чем я буду заниматься в Беларуси. Работаю в качестве волонтера в молодежном центре «Фиальта». Уже участвовал в нескольких образовательных программах, учу молодежь польскому языку».*

### Klaudia и Gosia, 24 и 25 лет, Польша

*«Мы были одними из первых добровольцев в Гродно. Сначала думали об одной из столиц: Москве, Санкт-Петербурге, Киеве или Минске, но в тот момент там не было интересных проектов. Зато был такой в Гродно. Сейчас работаем в журналистике, в «Центре информационной поддержки общественных инициатив», делаем интернет-газету и передачу на радио «Твой Стиль». Профессионально растем и получаем удовольствие. Работа волонтеров совершенно не скучная. Пока здесь немного добровольцев из-за рубежа, но мы надеемся, что после нашего проекта с EVS больше молодых людей со всей Европы захотят приехать в Беларусь».*

### Sania, 23 года, Латвия, волонтер в Беларуси в течение 8 месяцев

*«Я представитель русскоговорящего меньшинства Латвии, и у нас принято следовать программе — школа, университет, хорошая карьера в престижной компании. Так как возможность участвовать в программе Европейской службы волонтеров выпадает только раз в жизни, я подписался сразу на год. Он стал для меня захватывающей смесью трудностей и возможностей, хотя мои близкие считают пропуск года учебы ради работы международным добровольцем напрасной тратой времени. Волонтерство — это образ жизни, когда коллеги становятся друзьями, а друзья коллегами. EVS принесла мне огромную пользу. Я получил опыт, образование, связи и настоящих друзей. Это было одно из самых правильных решений, принятых мною в жизни».*







Региональный центр SALTO EECA организует:

- **информационную деятельность,** позволяющую облегчить организациям из стран Восточной Европы и Кавказа доступ к Программе действий и поощряющую сотрудничество с другими странами-партнерами;
- **учебные мероприятия,** поддерживающие неформальное образование и программы развития «Молодежь в действии»;
- **деятельность в области развития,** то есть, семинары и ознакомительные поездки, направленные на создание длительных партнерских отношений между организациями из стран программы партнерства.

SALTO Восточной Европы и Кавказа (EECA) обеспечивает поддержку:

- **организациям,** заинтересованным в развитии сотрудничества со странами Восточной Европы и Кавказа в рамках программы «Молодежь в действии»;
- **координаторам проектов,** молодежным работникам и тренерам;
- **молодежным лидерам** и волонтерам;
- **национальным агентствам** программы «Молодежь в действии».

**Подробности в информационном бюллетене www.salto-youth.net/newsletter**

фота: SALTO EECA

# «Жывая гісторыя майго краю»

**Пад такой назвай у Беларусі стартаваў праект, разлічаны на два гады і накіраваны на развіццё сельскіх рэгіёнаў краіны і мясцовых гісторыка-культурных ініцыятыў. Праект рэалізуецца Прадстаўніцтвам аб'яднання Deutscher Volkshochschul-Verband e.V. (Германія) у Беларусі (Прадстаўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў) у супрацоўніцтве з мясцовымі дзяржаўнымі і недзяржаўнымі партнёрамі пры падтрымцы Еўрапейскага Саюза (Праграма Non-State Actors and Local Authorities).**



Афіцыйная прэзентацыя праекта адбылася 11 верасня ў памяшканні Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Йоханэса Рау. У рамках праекта будзе ажыццяўляцца падтрымка 6 пілотных рэгіёнаў (г. Шчучын Гродзенскай вобласці, в. Выганашчы Брэсцкай вобласці, г. п. Шуміліна Віцебскай вобласці, в. Вежны Гомельскай вобласці, в. Радомля Магілёўскай вобласці, в. Семежава Мінскай вобласці), якія рэалізуюць праекты развіцця сваіх тэрыторый, грунтуючыся на вывучэнні і выкарыстанні мясцовай культуры, гісторыі і прыроднага ландшафту. Іх вопыт зможа стаць прыкладам для іншых рэгіёнаў, якія будуць мець магчымасць прыняць удзел у конкурсе міні-праектаў пад назвай «Жывая гісторыя маёй вёскі». Важная роля адведзена абласным інстытутам развіцця адукацыі, дзейнасць якіх, як мяркуецца, будзе спрыяць развіццю дадатковай адукацыі дарослых у сельскіх рэгіёнах Мінскай, Брэсцкай, Магілёўскай, Гродзенскай, Віцебскай і Гомельскай абласцей.

Міжнароднае грамадскае аб'яднанне «Адукацыя без межаў», Магілёўскае экалагічнае грамадскае аб'яднанне «ЭНДО», Маладзёжнае грамадскае аб'яднанне «Гісторыка» прымуць удзел у ажыццяўленні праекта.

Па дадатковую інфармацыю, калі ласка, звяртайцеся да Прадстаўніцтва Нямецкай асацыяцыі народных універсітэтаў:

**www.dvv-international.by**
**e-mail: info@dvv-international.by**
**тэл./факс: +375(17) 207 98 35**

фота: ПРААН, Particip GmbH

## «Сусветная ўборка 2012» у Гродне

15 верасня ў многіх краінах адбылося маштабнае прыбіранне лесапаркавых тэрыторый населеных пунктаў. Яе арганізатарамі і ўдзельнікамі ў розных краінах сталі добраахвотнікі — усе тыя, хто неабыякавы да праблем экалогіі і гатовы зрабіць пасільны ўнёсак у захаванне чысціні і парадку ў лясах ды парках.

Аархускі цэнтр у Гродна сумесна з Гродзенскай ініцыятывай «Чысты лес — чысты розум», а таксама Гродзенскім абласным камітэтам і гарадской інспекцыяй прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя арганізаваў уборку лясных масіваў Гродна ад бытавога смецця, а таксама несанкцыянаваных звалак у лесапарку горада. А сумесна з вучнямі і настаўнікамі мясцовых школ правёў уборку лесапарку «Пышкі» каля Гродзенскай абласной бальніцы.

«Не так ужо складана захапіць пакеты з пустымі бутэлькамі і данесці іх да бліжэйшага смеццевага кантэйнера. Так прыемна будзе ў наступны раз прыйсці ў чысты лес», — падзяліліся сваімі думкамі мясцовыя школьнікі.

Пасля некалькіх гадзін інтэнсіўнага прыбірання парк быў ачышчаны. Ліквідаваныя некалькі невялікіх звалак, што ўтварыліся ў месцах адпачынку гараджан.

*Аархускі цэнтр створаны ў рамках сумеснага праекта ЕС/ПРААН «Садзейнічанне развіццю ўсеабдымнай структуры міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне аховы навакольнага асяроддзя ў Рэспубліцы Беларусь». Афіцыйнае адкрыццё цэнтра запланавана на лістапад 2012 года.*

**Больш пра ініцыятыву на www.letsdoitworld.org**



# BYNANOERA: Европейское научное пространство на шаг ближе

**Завершился первый из двух этапов проекта «Институциональное развитие прикладного наноэлектромагнетизма: Беларусь в расширении европейского научного пространства», финансируемого по линии 7-й Рамочной программы научно-технологического развития ЕС (7РП).**







Задача трехлетнего проекта — совершенствование научного потенциала и кооперационных возможностей Института ядерных проблем Белорусского государственного университета в области прикладного наноэлектромагнетизма. Эта научная дисциплина, возникшая всего 7 лет назад, находится на стыке классической физики и электродинамики с квантовой теорией твердого тела, статистической физикой, физической кинетикой, квантовой химией и вычислительной математикой. При этом она имеет широкие перспективы создания новых материалов для использования в биофизике, медицине, ядерной оптике, детектировании ионизирующей радиации, экологическом мониторинге и не только. Лаборатория электродинамики неоднородных сред, возглавляемая профессором Сергеем Максименко, является ведущим научным центром страны в указанной области.

Партнеры Института в рамках проекта — это Институт физики твердого тела Технического университета Берлина, Центральная лаборатория физико-химической механики Академии наук Болгарии, Национальная лаборатория Фраскати Национального института ядерной физики (Италия) и Институт электроники и лазеров (Крит, Греция). Именно через совместные исследования, обмен учеными и открытие кооперационных сетей ведущих европейских центров для белорусов и развивается потенциал отечественной научной группы. Помогают ей в этом и две белорусские организации — Институт системного анализа и информационного обеспечения научно-технической сферы и Научно-технологический парк БНТУ «Политехник», отвечающие за организацию тренингов и научно-технических мероприятий.

В центре внимания проекта — группа из 20 исследователей, чей средний возраст не превышает 35 лет. За первые 18 месяцев проекта Европейская Комиссия профинансировала 13 человеко-месяцев работы ученых Института ядерных проблем в партнерских организациях стран ЕС. Акцент в стажировках делается на молодых ученых и аспирантов. Несмотря на то, что проект не предусматривает финансирования исследований как таковых (поддерживаются только мероприятия, способствующие осуществлению научной деятельности), результаты совместных работ нашли отражение в 19 статьях в реферируемых международных изданиях, в том числе в журнале Американского физического общества по проблемам конденсированных сред и физики материалов Physical Review B, а также в работе «Современные тенденции развития наноэлектромагнетизма», содержащей прогноз развития этого научного направления (основной автор — профессор Григорий Слепян).

Центральным событием проекта стала майская конференция «Фундаментальный и прикладной наноэлектромагнетизм», собравшая в Минске более 120 ученых из 19 стран. Уникальная по составу экспертов, она создала условия для обмена опытом и идеями, которые лягут в основу дальнейших совместных работ и новых проектов.

Хотя деятельность проекта направлена, главным образом, на Институт ядерных проблем БГУ, ряд мероприятий, например, тренинги, способствующие совершенствованию навыков международного сотрудничества, открыт для научной общественности Беларуси. Важен и первый в стране опыт координации проектов 7РП, который нарабатывает Сергей Максименко, готовый делиться информацией и опытом с заинтересованными. В качестве модели для других научных центров может послужить также стратегия развития Института ядерных проблем БГУ, разработка которой является одной из задач второго этапа проекта.

Благодаря этому проекту, коллектив Института ядерных проблем БГУ, возглавляемый кандидатом физико-математических наук Полиной Кужир, стал партнером в новом проекте «Фундаментальный и прикладной электромагнетизм наноуглерода» (FAEMCAR), который получил поддержку на конкурсе 7РП 2012 года. Этот проект стартует в конце текущего года.

**Подробнее о конференции на www.nano.bsu.by**
**Сайт программы: www.fp7-nip.org.by**

фота: EU FP7 NIP Belarus

# Навінавы мікс

EUCYS2012
BRATISLAVA






21-26 верасня ў Братыславе (Славенія) прайшоў 24-ы конкурс EUCYS для маладых навукоўцаў, у якім адну з трох трэціх прэмій 3500 еўра атрымаў 17-гадовы беларус Павел Літвінка з даследваннем «Распрацоўка апаратна-праграмнага комплекса IMPOSSIBLE Box для фарміравання трохмернай выявы».
EUCYS (European Union Contest for Young Scientists) — ініцыятыва, створаная Еўрапейскай Камісіяй у 1989 годзе дзеля падтрымкі маладых навукоўцаў ды садзейнічання абмену досведам паміж імі. Штогод у яе рамках праводзіцца выстава лепшых навуковых прац ды ідэй навукоўцаў з розных краін. Для EUCYS-2012 былі зацверджаныя 83 праекты з 37 краін, у тым ліку тры з Беларусі.

**Больш на www.eucys2012.eu**

8-9 верасня 2012 года ў горадзе Мцхету (Грузія) адбыўся другі вучэбны семінар фінансаванага Еўрапейскім Саюзам праекта «Кніжная платформа». Семінар «Стратэгіі ахопу аўдыторыі» прызначаўся для грузінскіх і армянскіх кніжных выдаўцоў і журналістаў, якія спецыялізуюцца ў галіне культуры і зацікаўлены ў пашырэнні сваёй аўдыторыі з дапамогай новых тэхналогій. Яго праграма прапанавала таксама індывідуальныя кансультацыі спецыялістаў кнігавыдання з Грузіі і Арменіі. Гэта інтэрактыўнае мерапрыемства прайшло пад кіраўніцтвам Ёхана Грэйфа (Швецыя), якому дапамагалі выдавец і спецыяліст па электроннай кнізе з Грузіі Сандра Асатыяні і эксперт па выдавецкай справе з Арменіі Карэн Маргаран.

**Больш на www.bookplatform.org**



Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў (БРФФД) адкрыў конкурсы навуковых праектаў для падтрымкі міжнароднага супрацоўніцтва ў 2013 годзе, у прыватнасці, «НАВУКА МС-2013» — конкурс праектаў па правядзенні фундаментальных даследаванняў, якія выконваюцца супольна з замежнымі навукоўцамі. Галоўная мэта конкурса — фінансавая падтрымка творчых навуковых калектываў і асобных вучоных, якія займаюцца рашэннем актуальных праблем па прыярытэтных напрамках фундаментальных навуковых даследаванняў: фізіка, матэматыка і інфарматыка, хімія і навукі аб Зямлі, тэхнічныя, медыка-фармацэўтычныя, аграрна-біялагічныя і гуманітарныя навукі.

**Тэрмін рэалізацыі праекта — 2 гады**
**Апошні дзень падачы заявак — 1 лістапада 2012 г.**
**Падрабязнасці на http://fond.bas-net.by**

фота: Particip GmbH




19 верасня 2012 г. ў рамках Парламенцкай асамблеі ЕЎРАНЭСТ у Еўрапейскім парламенце ў Бруселі адбыўся семінар-практыкум на тэму «Супрацоўніцтва ЕС з партнёрамі ва Усходняй Еўропе ў галіне энергетычнай бяспекі: дасягненні, перашкоды і перспектывы». Удзельнікі семінара абмеркавалі палітыку і ініцыятывы энергетычнага супрацоўніцтва ў рамках Усходняга партнёрства. Кіраўнік групы Тэхнічнага сакратарыяту праграмы INOGATE Кевін МакКанн прадставіў дасягненні і ход рэалізацыі энергетычнай праграмы INOGATE, што фінансуецца Еўрапейскім Саюзам, яе мэты ў галіне надзейнай, устойлівай і даступнай энергетыкі. Семінар быў арганізаваны Сакратарыятам і Аддзелам палітыкі ЕЎРАНЭСТ, а таксама Генеральным дырэктаратам EXPO для Камітэта па замежных справах і Камітэта па энергетычнай бяспецы Парламенцкай асамблеі ЕЎРАНЭСТ.

**Больш на www.inogate.org**

Выйшла чарговая штогадовая справаздача пад назвай «Агляд сітуацыі ў сферы адукацыі» (Education at a Glance). У ёй выкладзены аналіз стану сферы адукацыі 34-х краін Арганізацыі эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР), у тым ліку 21 краіны-сябра ЕС.

Еўракамісар па пытаннях адукацыі, культуры, шматмоўя і моладзі Андрула Васіліу лічыць, што дадзеныя справаздачы сведчаць: выгоды адукацыі значна пераважаюць над выдаткамі, якіх яна патрабуе. Камісар Васіліу заклікае: «Справаздача падкрэслівае патрэбу ў рэформах для мадэрнізацыі адукацыі, а таксама для таго, каб зрабіць яе больш прывабнай для студэнтаў і выкладчыкаў». У прыватнасці, дакумент звяртае ўвагу на старэнне выкладчыцкага складу (узрост больш як 40% настаўнікаў сярэдняй школы пяці краін ЕС — Аўстрыі, Чэхіі, Эстоніі, Нідэрландаў і Швецыі — перавышае пяцьдзесят гадоў, а ў Германіі ды Італіі колькасць такіх настаўнікаў перавышае 50%) і гендэрны дысбаланс у калектывах выкладчыкаў (у вышэйшай адукацыі ЕС працуе на трэць больш жанчын, чым мужчын).

Студэнты з-за межаў ЕС па-ранейшаму ахвотна паступаюць ва ўніверсітэты краін-сябраў Саюза. Паводле справаздачы, краіны-сябры Еўрапейскага Саюза прымаюць у сябе 41% усіх замежных студэнтаў (з краін ЕС і краін па-за Саюзам).

**Поўны тэкст справаздачы размешчаны па адрасе: www.oecd.org/edu/EAG%20 2012_English_100912.pdf**

**Падрабязнасці на http://www.oecd-ilibrary.org**






Беларускі рэспубліканскі фонд фундаментальных даследаванняў (БРФФД), Расійскі фонд фундаментальных даследаванняў (РФФД) і Дзяржаўны фонд фундаментальных даследаванняў Украіны (ДФФДУ), у адпаведнасці з Мемарандумам аб узаемадзеянні па пытаннях правядзення сумесных трохбаковых рэгіянальных конкурсаў прыгранічных абласцей, праводзяць трохбаковы міжрэгіянальны конкурс у прыгранічных Гомельскай, Бранскай і Чарнігаўскай абласцях на правядзенне фундаментальных даследаванняў па навуковых праблемах прыродакарыстання і экалогіі «БРФФД-РФФД-ДФФДУ — 2013»

**Заяўкі на конкурс у БРФФД падаюцца да 30 лістапада 2012 г.**
**Падрабязней на http://fond.bas-net.by**

★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★ ★



Таксама абвешчаны сумесны тэматычны конкурс даследчых праектаў Беларускага рэспубліканскага фонду фундаментальных даследаванняў і Аб'яднанага інстытута ядзерных даследаванняў «БРФФД — АІЯД-2013». Конкурс праводзіцца па наступных навуковых напрамках: фізіка мікрасвету, фізіка атамнага ядра, фізіка элементарных часціц, тэарэтычная фізіка, вывучэнне фізікі кандэнсаванага стану ядзерна-фізічнымі метадамі.

**Заяўкі на конкурс у БРФФД падаюцца да 30 лістапада 2012 г.**
**Падрабязней на http://fond.bas-net.by**

фота: Eoecd.org, Particip GmbH

# Брыё Бэлфлам

**Нарадзіўся ў 1993 годзе ў Court-st-Etienne, Бельгія. Навучаецца ў Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі па класе скрыпкі.**



фота: з асабістага архіва Брыё Бэлфлама

***

Я прыехаў у Мінск у кастрычніку 2011 года. Пейзажы мяне не здзівілі — яны вельмі падобныя да бельгійскіх. Затое па-сапраўднаму ўразіла мяне атмасфера Мінска — павольнасць людзей і адчуванне дзён. Тут куды больш спакойна, чым у Бельгіі. У маёй краіне ўсе кудысьці спяшаюцца, а ў Мінску ўтульна і ціхамірна.

***

Мяне захапляюць беларусы! Я ўражаны гэтымі людзьмі, якія цяжка працуюць і паважаюць правілы. Гэта неверагодна, калі чалавек жыве і працуе ў зусім нялёгкіх умовах і ніколі не скардзіцца і не зрываецца.

***

Цяжкавата было прызвычаіцца да рубля. Асабліва да таго, што за рэч, якая каштуе ў Бельгіі 1 еўра, у Беларусі трэба выкласці ажно 10 тысяч! Напачатку гэта было вельмі дзіўна. Да таго ж быў шакіраваны холадам. Мінус 25°С у Бельгіі ўявіць немагчыма! Таму спачатку вельмі пакутваў, але потым адаптаваўся. А ў астатнім жыццё студэнта ў Беларусі не вельмі адрозніваецца ад жыцця студэнта ў Бельгіі.

***

Што тычыцца музыкі, то узровень яе выкладання і валодання ёю ў Беларусі значна лепшы, чым у Бельгіі. У нас амаль усе беларускія вучні лічыліся б адоранымі дзецьмі. Па сваёй спецыяльнасці — скрыпка — я вельмі адчувальна прасунуўся за год. Не, ансамбль свой з беларускімі калегамі пакуль не стварыў.

***

Прызнаюся, я па натуры трохі гультаяваты, але патрабаванні і нагрузка ў Акадэміі музыкі такія, што вымушаны быў тэрмінова мяняць падыход да жыцця і навучання.

***

Вельмі ганаруся, што ўжо трошкі размаўляю на рускай мове. У наступным годзе спадзяюся выйсці на добры ўзровень валодання ёю.

***

Сярод маіх сяброў з'явілася шмат беларусаў. З імі я адчуваю сябе гэтак жа камфортна, як і са сваімі бельгійскімі сябрамі. Захапленні ў нас у такім узросце ва ўсіх падобныя — што ў бельгійцаў, што ў беларусаў.

***

Скрыпка адбірае большасць майго вольнага часу. Але калі выдаецца вольная хвіліна, я іду гуляць з сябрамі па горадзе — люблю знаходзіць новыя месцы.

***

Мой інтэрнат знаходзіцца каля Старога горада. Я шмат шпацырую і там, і не толькі. Асабліва люблю плошчу Якуба Коласа і ўвесь горад увечары, на змярканні.

***

Хачу быць настаўнікам скрыпкі. Для маёй будучай кар'еры навучанне ў Мінску будзе вельмі значным, у многім нават перавагай перад іншымі. Я тут застаюся на пяць гадоў. Беларускія і бельгійскія дыпломы «неканвертуемыя», таму давядзецца дадаткова атрымліваць ступень магістра на працягу двух гадоў яшчэ ў якой-небудзь іншай краіне.

# Дзень Еўрапейскага супрацоўніцтва

**21 верасня Еўропа адзначыла Дзень Еўрапейскага супрацоўніцтва. У рамках гэтай глабальнай ініцыятывы Еўрапейскай Камісіі, накіраванай на інфармаванне шырокіх колаў грамадскасці аб развіцці еўрапейскага памежнага супрацоўніцтва, 17-23 верасня па ўсёй Еўропе адбылося больш за 140 мерапрыемстваў.**

**Падрабязнасці на www.ecday.eu**







фота: INTERACT








region Vienna-Bratislava
e-on




European



## АНОНСЫ

**20 ВЕРАСНЯ — 13 СНЕЖНЯ, БРУСЕЛЬ**
Імпрэза «Ночы ў музеях» будзе праходзіць па чацвяргах з 17:00 да 22:00. У акцыі прымуць удзел больш за 50 выставачных цэнтраў і галерэй, размешчаных па ўсёй тэрыторыі рэгіёну. Акцыя, якая адбудзецца ўжо ў 12-ты раз, сёлета прысвечана гастранамічнай культуры бельгійскай сталіцы.

**16—17 КАСТРЫЧНІКА, ІАРДАНІЯ**
На беразе Мёртвага мора адбудзецца 5-я штогадовая канферэнцыя праекта Транспамежнага супрацоўніцтва.
Падрабязнасці
на *www.interact-eu.net*

**15—20 КАСТРЫЧНІКА, ПОЛЬШЧА**
Адбудзецца чарговая міжнародная сустрэча Еўрапейскай асацыяцыі студэнтаў ландшафтнай архітэктуры (ELASA). Такія сустрэчы праходзяць 2-3 разы на год і збіраюць да 60 удзельнікаў з розных краін Еўропы. Асноўная мэта такіх сустрэч — абмен досведам і ідэямі паміж студэнтамі ландшафтнай архітэктуры.
Падрабязнасці
на *www.poland2012.elasa.org*

**29—30 ЛІСТАПАДА 2012, ШВЕЦЫЯ**
Форум грамадзянскай супольнасці «Усходняга партнёрства»
Форум быў заснаваны для садзейнічання развіццю грамадзянскай супольнасці ў краінах-партнёрах, палягчэння яе кантактаў з уладамі і актывізацыі супрацоўніцтва паміж грамадзянскімі супольнасцямі Еўрапейскага Саюза і краін-сябраў. Да ўдзелу запрашаюцца прафсаюзы, недзяржаўныя аб'яднанні, некамерцыйныя фонды, навукова-даследчыя цэнтры ды іншыя адпаведныя ўдзельнікі грамадзянскай супольнасці.
Больш на *www.eap-csf.eu*

## КАРОТКІЯ НАВІНЫ

Апублікаваны даведнік з апісаннем праектаў міжнароднага супрацоўніцтва, падтрыманых у межах Сёмай рамачнай ЕС (праграмы магчымасцяў) на перыяд з 2007 па 2013 гг. Сёмая рамачная праграма надае асаблівую ўвагу міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне даследаванняў і адкрыта для ўдзелу трэціх краін. Усе праекты сабраныя ў часткі па краінах і рэгіёнах. Па кожным прыведзены мэты, межы дзеяння і чакаемыя вынікі, а таксама ўключаны спіс усіх удзельнікаў і кантактных асобаў.
*http://ec.europa.eu/research/iscp/pdf/projects_in_support_publication.pdf*

З нагоды Сусветнага тыдня вады, які адзначалі ў Стакгольме з 26 па 31 жніўня, Еўрапейскі камісар па справах навакольнага асяроддзя Янез Паточнік паведаміў, што да канца года Еўракамісія агучыць свае прапановы па барацьбе з паводкам, засухай, недахопам вады, а таксама па паляпшэнню якасці і прадуктыўнасці водных рэсурсаў. Усе захады будуць апублікаваныя ў стратэгічным дакуменце пад назвай «Праект па ахове еўрапейскіх водных рэсурсаў».
*http://www.worldwaterweek.org/*

12-14 верасня з нагоды Дня еўрапейскага супрацоўніцтва ў Белавежскай пушчы прайшоў II Трансгранічны форум журналістаў. Было прадстаўлена 27 праектаў, якія фінансуюцца Трансгранічнай праграмай «Польшча-Беларусь-Украіна — 2007-2013». У прыватнасці, польска-беларускі праект «Забеспячэнне прывабнасці памежнага рэгіёна праз увядзенне этнакультурных рэсурсаў у турыстычныя імрэзы » і «Будаўніцтва і абсталяванне аўтадарожнага памежнага пункта пропуску Пясчатка — 3 этап».

16-22 верасня распачаўся тыдзень еўрапейскай мабільнасці, які штогод адзначаецца ў верасні па ініцыятыве Еўрапейскай Камісіі. Галоўная мэта кампаніі — заахвоціць мясцовыя ўлады выкарыстоўваць экалагічныя транспартныя сродкі. На працягу гэтага тыдня гарады, што прымаюць удзел у ініцыятыве, выдзяляюць асобныя часткі горада для пешаходаў, раварыстаў і грамадскага транспарту. З нагоды «дня без аўтамабіля» брусельцы, напрыклад, «пераселі» на грамадскі транспарт, праезд у якім 22 верасня быў бясплатным, ровары, ролікі і нават коней.

## КАРЫСНЫЯ СПАСЫЛКІ

**enpi-info.eu** — штотыднёвая рассылка інфармацыйнага цэнтра палітыкі суседства пра магчымасці для ўдзелу ў праектах і праграмах

**salto-youth.net** — сетка, што складаецца з 8 рэсурсных цэнтраў ініцыятывы «Salto-моладзь», якая ў рамках Еўрапейскай моладзевай праграмы падтрымлівае моладзь і прадастаўляе ёй магчымасці для нефармальнай адукацыі

**europa.eu** — галоўны інтэрнэт-партал Еўрапейскага Саюза

**europa.eu/rapid** — прэс-рэлізы ўсіх інстытутаў і структур ЕС са зручнай сістэмай пошуку, у тым ліку рэферат штодзённай прэс-канферэнцыі, што транслюецца ў прамым эфіры апоўдні (па Брусельскім часе) на партале «Еўропа праз спадарожнік»

**ec.europa.eu/avservices** — мультымедыйная бібліятэка з вялікім выбарам фота-, аўдыё- і відэаматэрыялаў, звязаных з дзейнасцю афіцыйных структур ЕС europa.eu/newsroom — спецыялізаваная старонка для журналістаў

**http://ec.europa.eu/europeaid/how/public-consultations/towards_post-2015-development-framework_en.htm** — старонка, прысвечаная грамадскім кансультацыям EuropeAid «На шляху да стратэгіі развіцця пасля 2015 года»